[Электронный ресурс] / Редкол.: Л. А. Вербицкая [и др.]. – Санкт-Петербург: РОПРЯЛ, 2017. – С. 102 – 107

12. Симбирцева Н.А. "Код культуры" как культурологическая категория / Н.А. Симбирцева // Знание. Понимание. Умение. – 2016. – № 1. – С. 157 – 168

13. Что такое дизайн сайта : 5 этапов его создания в 2022 году [Электронный ресурс] . – Режим доступа : https://sheer82.ru. – Дата доступа : 31.10.2022

Коноплина Ю.М., студент 213к группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Васюк Т.И., доцент

## КАФЛЯРСТВА Ў ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНЫМ МАСТАЦТВЕ БЕЛАРУСІ

На тэрыторыі Беларусі керамічная вытворчасць вядома яшчэ з эпохі неаліту. Тады з’явіліся першыя гліняныя пасудзіны. Вынаходства керамікі дало магчымасць чалавеку таго часу выказаць свае творчыя здольнасці. Яны адкрылі пластычныя і арнаментальныя рашэнні. З’яўляюцца унікальныя тэхнікі стварэння посуду і арнаментацыі. У бронзавым веке посуд становіцца пласкадонным, а арнамент набывае сціпласць і мастацкую вытанчанасць. Пазней калі з’яўляюцца гарады керамічныя вырабы становяцца прафесійнай справай.

Адным із каштоўнейшых археалагічных помнікаў з’яўляюцца кафляныя вырабы. Першыя вядомыя нам кафлі на тэрыторыі Беларусі належаць да самага пачатку XIV ст. [1, с. 4]. Яны знойдзены у час археалагічных раскопаў у Полацку, Лідзе і Навагрудку. Выраблялiся яны метадам ляпной тэхнікі, потым іх падпраўлялі на ганчарным крузе і абпальвалі на адкрытым агні. Такія кафлі выконвалі толькі тэхнічныя функцыі: павышалі цеплааддачу, аблягчалі канструкцыю.

Пазней печы, складзеныя з кафлі, пачалі ўносіць у інтэр'ер мастацкі духоўна-вобразны змест, займаць вядучае кампазіцыйнае гучанне. На мяжы XV – XVI ст. майстрамі пачынаюць ўжывацца палівы, якія дапоўнілі мастацкую палітру кафлі, палепшылі яе ўтылітарныя якасці, надалі кафлі большую каштоўнасць [1, с. 5].

У канцы XV – пачатку XVI ст. адбываецца рэканструкцыя формы кафлі. Надаецца ўвага выяўленчым сродкам. Асновай паслужылі міскавыя і талеркавыя кафлі з традыцыйнымі для ганчарных вырабаў малюнкамі на дне ў выглядзе прамых ці хвалістых ліній [1, с. 5]. На дне такой кафлі рабілі узоры. Але ж такія кафлі было нязручна мацаваць у печы. Тады пачалі да донца прырабляць гліняны цыліндрык такога ж дыяметру, зроблены на ганчарным крузе. У выніку з'яўляецца новы тып кафлі, так званы “каробкавы”, дзе дно кафлі ранейшага тыпу наблізілася да вусця, а венца вусця стала выконваць ролю высокай рамкі. Па баках цыліндрыка рабіліся дзіркі для ўмацавання кафлі ў сценцы печы. Наблізіўшыся да вонкавай паверхні, ранейшае дно зрабілася вонкавай пласцінаю з нанесеным на яе паверхню малюнкам.

На Беларусі працэс пераходу ад гаршковай да каробкавай кафлі ішоў паволі, на працягу XV – першай паловы XVI ст. Прычым ужывалася гаршковая кафля і пазней, у XVII і, магчыма, у пачатку XVIII ст., асабліва ў вясковай мясцовасці. Спачатку рэльефная гаршковая кафля выраблялася толькі ў буйных беларускіх рамесных асяродках, дзе кафляры былі добра знаёмы з тэхналогіяй вырабаў тэракотавай, а потым і паліванай кафлі ў гарадах Заходняй Еўропы [1, с. 6]. Самыя старажытныя экземпляры каробкавай кафлі былі знойдзены падчас раскопак палаца ў Полацку.

Да нашых часоў захавалася ўнікальная печ, аблямаваная распіснай кафляй XVIII – пач. XIX ст. у шляхецкай сядзібе Жамыслаў Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці [1, с. 23]. Гэта складаная двухпавярховая пабудова шматграннай формы. Ніжняя і верхняя часткі печы аблямаваны кафляй з расліннымі ці геаметрычнымі сюжэтамі. Цэнтральную частку печы складаюць кафліны з рознымі сюжэтнымі сцэнкамі. Побач з кафлямі складанай

канфігурацыі, пакрытымі белымі эмалямі і ўпрыгожанымі роспісам, працягвала бытаваць кафля традыцыйная, палітая празрыстымі зялёнымі, карычневымі, рудымі глазурамі, дэкарыраваная матывамі, распрацаванымі яшчэ ў канцы XVI – пачатку XVII ст. Такая з'ява тлумачыцца тым, што разам з фабрыкамі, падпарадкаванымі заможным уладальнікам, якія выконвалі заказы найбольш багатай часткі насельніцтва, працягвалі існаваць шматлікія саматужныя ганчарныя майстэрні з больш таннай прадукцыяй, якія і ўносілі ў вытворчасць своеасаблівы народны каларыт. Багатыя заказы спрыялі дыферэнцыяцыі ганчарнай вытворчасці, якая назіраецца з канца XVIII ст. Вялікі попыт на кафляныя вырабы, новая тэхналогія з прымяненнем гіпсавых форм, адказ ад ганчарнага кола, грамадска-сацыяльныя змены, разлад цэхавай сістэмы рамеснікаў, падзел працы ствараюць умовы для вылучэння кафлянай вытворчасці ў самастойную галіну. Акрамя магнацкіх фабрык і заводзікаў пачынаюць узнікаць прадпрыемствы капіталістычнага тыпу па выпрацоўцы кафлі. У канцы XIX ст. на беларускіх землях існуе сетка кафляных заводаў, што ўзніклі ў традыцыйных месцах ганчарнай вытворчасці. Гэта – Бабруйск, Барысаў, Віцебск, Шклоў, Копысь, Крупкі, Мінск, Навагрудак, Слаўгарад і іншыя. Прадукцыя гэтых заводаў задавальняла не толькі ўнутраны рынак, але ішла і далёка за межы тагачаснага «Северо-Западного края» [1, с. 24].

У канцы XIX – першай чвэрці XX ст. на Беларусі аднаўляецца выраб кафлі, пакрытай карычневай палівай з рэльефам, выкананым у больш рэалістычнай і складанай манеры.

Немагчыма ўявіць сабе паверхню печаў без вуглоў, выступаў і ярусаў. Пачынаючы з XVI ст. для абліцоўкі печаў, паводле іх форм і прызначэння, вырабляюць сценную, вуглавую, паясовую і карнізную каробкавыя кафлі. Печы афармляюцца з высокім густам кафляй іншых форм: каронкай, дахоўкай, балясінамі, медальёнамі. Вялікая колькасць арнаментаў кафлі, што знойдзена ў замкавым комплексе “Мір” і ў гарадскім пасёлку Мір, сведчыць аб развітасці дадзенага віду рамяства ў Сярэднявеччы ў гэтай мясцовасці. Каронкавая кафля завяршае верх печы. У профілі яна вырабляецца ў форме вугалка. Муравалася

ў печ гарызантальнай паліцай, прымацаванай да ніжняй часткі доўгай планкі. Апошняя аздабляецца па вонкавай частцы геаметрычным або раслінным арнаментамі, нярэдка з антрапаморфнай, анімалістычнай выявамі. Планка падзяляецца на ніжнюю прамавугольную і верхнюю зубчастую часткі [2]. Контур зубчастага верху планкі нагадвае дахі пабудоў. У калекцыі замкавага комплекса “Мір” ёсць каронкавыя кафліны XVI – XVII ст.ст., у якіх ніжняя, прамавугольная частка вонкавай паверхні арнаментавана ў форме крыжа, а зубчастая – трохвугольнікамі [2]. Арнаментацыя з касога крыжа на планцы і трохвугольнікаў аздабляе каронкавую кафлю XVI ст. выяўленую ў Смаленску маскоўскім археолагам Міхаілам Гусаковым. Беларускае кафлярства значна паўплывала на развіццё вытворчасці кафлі і ў Расіі, дзе працавалі майстры з Копысі, Мсціслава, Дуброўны, Віцебска і іншых гарадоў. Кафляй, зробленай рукамі беларускіх майстроў, аздоблены адзін з палацаў Крамля, Круціцкі церам, царква Георгія Неакесарыйскага ў Маскве, Уваскрасенскі сабор Новаіерусалімскага манастыра ў Істры.

Такім чынам, кафлярства займала вялікую нішу ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве беларускіх земляў на працягу некалькіх стагоддзяў, а таксама паўплывала на развіццё кафлянай вытворчасці ў суседніх краінах.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1.Трусаў, А. А. Беларускае кафлярства / А. А. Трусаў. – Мінск, 1993. – 40 с.

2.Трусаў, А. А. Кафляныя печы беларускіх замкаў / А. А. Трусаў // Матэрыяльная і духоўная культура замкаў Беларусі. – Мінск, 2003.